# *ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ*

**УДК 82.09**

## ДАСЛЕДАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ ПСІХАЛАГІЗМУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ Ў ПРАЦАХ А.П. МАТРУНЁНКА

***А.М. ЧАРНАВОКАЯ***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск)***
***lecsa87@gmail.com***

*Артыкул прысвечаны навуковай дзейнасці літаратуразнаўцы Альфрэда Пятровіча Матрунёнка, які нарадзіўся ў вёсцы Падобы Віцебскай вобласці. А.П. Матрунёнак даследаваў творчасць Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Кузьмы Чорнага, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Івана Мележа і інш. Адметнасць яго прац – паглыблены прафесійны аналіз мастацкіх тэкстаў, арыентацыя на канкрэтную методыку даследавання. А.П. Матрунёнак з цікавасцю ставіўся да еўрапейскай прозы другой паловы XX ст., звяртаў увагу як на поспехі беларускай літаратуры, так і на яе праблемы, абумоўленыя адмоўнымі тэндэнцыямі савецкай эпохі. У працах А.П. Матрунёнка выяўляюцца асаблівасці творчай манеры беларускіх пісьменнікаў, супастаўляюцца розныя падыходы да псіхалагічнай распрацоўкі персанажаў.*

***Ключавыя словы:*** *гісторыя беларускага літаратуразнаўства, аналіз мастацкага тэксту, аналітычны псіхалагізм, персанаж, савецкая ідэалогія.*

**Уводзіны.** У асяроддзі беларускіх літаратуразнаўцаў 1970–1980-х гг. адметнай асобай быў Альфрэд Пятровіч Матрунёнак – нараджэнец вёскі Падобы Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці. Свае навуковыя росшукі А. Матрунёнак прысвяціў праблеме псіхалагізму ў беларускай прозе XX ст. (творах Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Кузьмы Чорнага, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Івана Мележа і інш.). Працам А.П. Матрунёнка ўласцівая даследчыцкая смеласць, арыентацыя на канкрэтную методыку даследавання, мінімум эсэістычнасці і максімальная абгрунтаванасць высноў.

Як зазначаў В.Я. Халізеў, у працах многіх савецкіх літаратуразнаўцаў меў месца погляд як бы «скрозь твор»: увага была сканцэнтравана на культурна-гістарычным ці сацыяльным кантэксце, ідэйных уплывах, фактах біяграфіі пісьменнікаў і г.д. [1, с. 9]. Даследаванні А.П. Матрунёнка прыкметна адрозніваліся на агульным фоне скіраванасцю на аналіз менавіта мастацкіх тэкстаў. Выключную значнасць для яго мелі факты, «здабытыя шляхам уважлівага тэкстуальнага аналізу» [2, с. 183], якія былі адзінай падставай для высноў і падагульненняў.

Калі беларускія навукоўцы нярэдка пісалі пра творы вельмі агульна, акрэсліваючы гісторыка-культурны кантэкст, лаканічна звяртаючыся да розных узроўняў твора (ідэя, праблема, сюжэт, кампазіцыя, сістэма персанажаў), то А.П. Матрунёнак меў канкрэтны аб'ект даследавання і дакладную метадалогію. Азначаючы свой навуковы метад ён пісаў, што мае на мэце «прайсці дарогу твора і прасачыць паслядоўны рад чалавечых дзеянняў, рухаў, жэстаў – знешніх і унутраных, звяртаючы асаблівую ўвагу на тое, у якой меры яны выяўляюць псіхалогію характару» [3, с. 40]. Праз увесь твор даследчык быў побач з героем і назіраў, як аўтар канструюе яго вобраз, звяртаючыся да розных тыпаў псіхалагізму, якую мастацкую ролю адыгрываюць у творы апісанні і дыялогі, прасочваў, як спалучаюцца простая і няўласна-простая мова, вызначаў адметнасці падыходу розных пісьменнікаў да стварэння вобразаў-персанажаў.

Уважлівы аналіз твораў быў, безумоўна, плённым: у працах даследчыка шмат трапных назіранняў і цікавых ідэй, якія могуць быць развітыя ў сучасных працах. З гэтай прычыны бачыцца актуальным невялікі агляд навуковай дзейнасці А.П. Матрунёнка, які можа быць карысны для ўсіх, хто вывучае беларускую прозу XX стагоддзя.

**Асноўная частка.** А.П. Матрунёнак нарадзіўся 5 студзеня 1940 г. Вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Яшчэ да паступлення ў аспірантуру Акадэміі навук БССР быў аўтарам некалькіх навукова-папулярных выданняў: «Школа юнага рыбалова» (1960) і «Для цікаўных» (1964) – невялікага зборніка апавяданняў пра незвычайныя рэчы, з'явы і навуковыя вынаходніцтвы.

У 1968–1993 гг. А.П. Матрунёнак працаваў у Інстытуце літаратуры Акадэміі навук БССР, у 1969 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Выдаў тры аўтарскія манаграфіі: «Псіхалагічны аналіз у сучасным беларускім рамане» (1972), «Псіхалагічны аналіз і станаўленне беларускага рамана» (1975), «Псіхалагічная проза: Традыцыі і час» (1988). Быў аўтарам калектыўнай манаграфіі «Нараджэнне новага мастацтва» (1980, разам з Л.Я. Гараніным і А.С. Яскевічам).

Праца «Псіхалагічны аналіз у сучасным беларускім рамане» (1972) была для беларускага літаратуразнаўства «першай спробай даследавання псіхалагічнага аналізу ў тыпалагічным плане» [4, с. 80], што неаднойчы адзначалі калегі А.П. Матрунёнка [2, с. 186], [5, с. 144]. У гэтай манаграфіі, як і ў далейшых працах, даследчык вылучаў два асноўныя тыпы псіхалагізму: дынамічны і аналітычны. Прыклад дынамічнага (знешняга) псіхалагізму – проза А.С. Пушкіна, дзе «раскрыццё духоўнага вобліку герояў неаддзельна

ад апісання іх дзеянняў, учынкаў» [3, с. 18], на першым месцы знаходзіцца паказ знешняга жыцця, тым часам як выяўленне жыцця ўнутранага адыходзіць на другі план.

Аналітычны псіхалагізм, пры якім на першым месцы знаходзіцца «жыццё ўнутранае, рэфлексія і самааналіз» [3, с. 88], разглядаўся найперш на матэрыяле прозы М.Ю. Лермантава. А.П. Матрунёнак адзначаў, што дынамічны і аналітычны псіхалагізм «нягледзячы на іх пэўную процілегласць, нельга ўяўляць ізаляванымі адзін ад аднаго. Узаемадзейнічаючы паміж сабой, яны даюць мноства пераходных з'яў» [3, с. 150], што дазваляе вылучыць трэці – сінтэтычны – тып псіхалагізму, які прысутнічае ў творах, дзе «немагчыма выявіць перавагу адной формы псіхікі над другой» [3, с. 151] – як у рамане Л.М. Талстога «Вайна і мір».

Даследчык неаднойчы звяртаў увагу на тое, што пытанне псіхалагізму ў савецкай літаратуры і літаратуразнаўстве было востра дыскусійным. Арыентацыя на апсіхалагізм прадвызначыла тое, што «прац агульнага плана, якія разглядалі б пытанні тэорыі псіхалагічнага аналізу ў розных яе аспектах» [3, с. 9] на той час было вельмі мала.

Безумоўна, у вылучэнні асноўных тыпаў псіхалагізму А.П. Матрунёнак ішоў следам за расійскімі даследчыкамі: акадэмікамі М.Б. Храпчанкам і Д.Д. Благім, літаратуразнаўцамі У.Я. Лакшыным, В.В. Кожынавым, Л.М. Мышкоўскай. Але падрабязны разгляд тыпаў псіхалагізму на матэрыяле беларускай прозы (раманах І. Шамякіна, Я. Брыля і І. Мележа) быў актуальным, бо даследчык, па-першае, дэманстраваў новы падыход да аналізу твораў, па-другое, вылучаў асаблівасці творчай манеры беларускіх пісьменнікаў.

Творчасць Івана Шамякіна А.П. Матрунёнак пазіцыянаваў як прыклад дынамічнага псіхалагізму: «Там, дзе раманіст мае справу з перадачай псіхічнага жыцця … праз учынкі, жэсты, знешнасць, г. зн. праз знешняе дзеянне, там ёсць не толькі праўда думак, але і пачуццяў, перажыванняў … як толькі справа даходзіць да паказу працэсу ўнутранага жыцця, непасрэдна ў форме рэфлексіі, самааналізу, плыні свядомасці, знікае ўнутраная логіка … пачынаецца адвольнае канструяванне статычных псіхічных станаў, слаба звязаных з папярэднімі і з наступнымі» [3, с. 84]. Датычна рамана «Сэрца на далонях» даследчык адзначаў, што «з усіх сродкаў псіхалагічнай абмалёўкі характару пісьменнік аддае яўную і неаспрэчную перавагу дыялогу» [3, с. 61]; многія сцэны твора пабудаваны па ўсіх законах драматычнага мастацтва – але мы «глядзім» на іх вачыма І. Шамякіна [3, с. 45] – што ёсць прыкметай дынамічнага псіхалагізму.

Пра Янку Брыля – «лірыка па характары свайго таленту» [3, с. 96] – даследчык адзначаў, што ўсе яго буйныя рэчы – «гэта творы звычайна аднаго героя і ўяўляюць сабой карціны жыцця, убачаныя як бы "знутры", з пазіцый гэтага галоўнага героя. Выдзяляючы яго для сябе сярод іншых персанажаў, аўтар затым максімальна набліжае сваё успрыманне жыцця да ўспрымання яго гэтым героем» [3, с. 96]. Найбольш вядомы твор гэтага аўтара – раман «Птушкі і гнёзды» – створаны праз зварот да аналітычнага псіхалагізму, што пацвярджаецца аналізам партрэтных замалёвак, дыялогаў, унутраных маналогаў.

Прыкладам трэцяга – сінтэтычнага – тыпу псіхалагізму паўстае раман І. Мележа «Людзі на балоце». Персанажы гэтага твора для аўтара раўназначныя – «кожнага з іх пісьменнік даследуе з аднолькавай увагай, кожнаму "дае слова", дае магчымасць выказаць свае меркаванні, думкі і пачуцці, свой погляд на тыя або іншыя з'явы жыцця, падзеі, асоб» [3, с. 165], што робіць твор блізкім да поліфанічных раманаў Ф.М. Дастаеўскага [3, с. 202]. «Іван Мележ у аднолькавай меры валодае майстэрствам перадачы як унутранага жыцця герояў, так і іх знешняга жыцця <…> Адзінства гэтых двух метадаў пазнання псіхалогіі чалавека дазволіла раманісту па-сапраўднаму глыбока і зразумець і паказаць у рамане сваіх герояў» [3, с. 173] – падкрэсліваў А. Матрунёнак.

Варта зазначыць, што першая праца А. Матрунёнка была дастаткова нехарактэрнай для тагачаснага беларускага літаратуразнаўства, пра што яскрава сведчыць яе абмеркаванне ў перыёдыцы. Рэцэнзент У.М. Юрэвіч дастаткова высока ацэньваў манаграфію, але падыход А. Матрунёнка падаваўся яму новым і нязвыклым: «Мы прызвычаіліся ў літаратуразнаўчых і крытычных працах больш бачыць раскрыццё сацыяльнай сутнасці твора, і кожны захад, скіраваны на высвятленне сродкаў, якімі пісьменнік рэалізуе сваю мастацкую ідэю, часам бянтэжыць незвычайнасцю падыходу да літаратурнай з'явы знутры, ад слова як першаасновы літаратуры. Але мне здаецца, што А. Матрунёнак, дэталёва разбіраючы сказы з рамана, сацупае пад час на малаплённую сцежку анатаміравання тэксту» [6, с. 230]. У якасці прыкладу прыводзілася месца, дзе даследчык цытаваў даволі вялікі дыялог, прасочваючы, як пісьменнік характарызаваў герояў праз рэмаркі і простую мову. Гэты фрагмент наўрад ці можа выклікаць пытанні сёння, але ў пачатку 1970-х. гг. такая занураннасць у тэкст выглядала падазронай.

У.М. Юрэвіч звяртаў увагу на тое, што «патрэбна больш усебаковае, глыбокае даследаванне» [6, с. 233], бо першая праца выканана на падставе аналізу некалькіх твораў. Рэцэнзенту не імпанавалі занадта вузкія вывады, якія тычыліся менавіта даследаванага матэрыялу і былі каштоўныя сваёй абсалютнай абгрунтаванасцю. Разам з тым, новы падыход падаваўся крытыку патрэбным, бо «да спецыфічна эстэтычных пытанняў мастацтва слова нашы крытыка і літаратуразнаўства звяртаюцца яшчэ рэдка і нясмела. Занятак гэты куды больш турботны, чым пераказваць змест твора» [6, с. 233] – і праца А. Матрунёнка была рэалізацыяй менавіта гэтага «вузскаскіраванага» падыходу.

Рэцэнзія Г.Д. Сіненкі была больш добразычлівай, папрок У.М. Юрэвіча ў празмерным «анатаміраванні тэксту» падаваўся рэцэнзенту неабгрунтаваным. «Менавіта дэталёвы аналіз слова як першаэлемента мастацкага твора ёсць магчымасць пранікнення ў творчую лабараторыю пісьменніка. <…> Калі аўтар ставіць мэту аб'ектыўнага даследавання пэўнай эстэтычнай катэгорыі, то чым больш глыбока і тонка ён "праанатаміруе" тэкст, тым больш эфектыўным будзе вынік» [2, с. 184].

Г.Д. Сіненка, кандыдат філалагічных навук, выкладчык БДУ, быў больш дасведчаны ў тонкасцях літаратуразнаўства, і, верагодна, часцей сустракаўся з вузкаскіраванымі даследаваннямі, чым У.М. Юрэвіч – вядомы журналіст, крытык, радыёвядучы. Паленіка яскрава сведчыць, што даследаванне, дзе аўтар быў не схільны разважаць на агульныя тэмы, а аналізаваў менавіта тэкст – прафесійна, дэталёва, арыентуючыся на пэўную метадалогію, – было з'явай не тыповай для літаратуразнаўства пачатку 1970-х гг., і вартасць такіх прац магла ставіцца пад сумнеў. Магчыма, адгукаючыся на крытычныя заўвагі, А.П. Матрунёнак у пазнейшай манаграфіі падкрэсліваў: «Вузкасць праблематыкі не варта блытаць з дробнасцю. Звужэнне поля зроку кампенсуецца павелічэннем яго "кратнасці", што дазваляе заўважыць такія "дэталі" і "дробязі", якія могуць не толькі ўдакладніць, але і карэнным чынам змяніць усю канцэпцыю» [7, с. 263].

Важна падкрэсліць, што А.П. Матрунёнак быў аб'ектыўным у ацэнцы твораў і не лічыў апрыёры «лепшым» пэўны тып псіхалагізму. Проза А.С. Пушкіна была ў гэтым плане важным аргументам: «няразвітасць у пушкінскай прозе прамога паказу ўнутранага жыцця, вядома, не значыць, што ў ёй не раскрываецца псіхалагічны змест вобраза. Адсутнічае толькі "непасрэдны псіхалагізм" (Л.М. Мышкоўская), г. зн. прамы паказ плыні думак і пачуццяў, раскрыццё псіхалогіі ў яе ўнутранай суб'ектыўнай форме» [8, с. 39].

«Якім шляхам ісці? Паказваць псіхалагічнае жыццё герояў знешне, "аб'ектыўна", у такіх формах, якія даступны назіранню збоку, дапускаючы толькі паасобныя апісанні і замалёўкі ўнутраных перажыванняў і псіхалагічных станаў для матывіроўкі паводзін, учынкаў, дзеянняў, ці, наадварот, апісваць у рамане перш за ўсё унутранае жыццё, рух саміх пачуццяў, перажыванняў, станаў, адводзячы "аб'ектыўнаму" раскрыццю псіхалогіі другарадную ролю?» [8, с. 44]. А.П. Матрунёнак не прапаноўваў адзінага адказу на пытанне і дапускаў абсалютна свабодны выбар паміж гэтымі варыянтамі – галоўнае, каб абраны шлях быў найбольш арганічны для творцы і прыводзіў да аптымальных мастацкіх вынікаў.

У наступнай манаграфіі – «Псіхалагічны аналіз і станаўленне беларускага рамана» – даследчык звярнуўся да аналізу беларускай прозы першай паловы XX стагоддзя. У першым раздзеле ён разглядаў розныя падыходы да выяўлення ўнутранага жыцця чалавека ў розных родах літаратуры. Далей, абвясціўшы раман сінтэтычным жанрам, які «стаіць як бы на чале ўсёй літаратуры» [8, с. 32] – і, умоўна кажучы, знаходзіцца па-над літаратурнымі родамі – А.П. Матрунёнак прапаноўваў вылучаць тры «самастойныя спосабы псіхалагічнага аналізу» [8, с. 35] – эпічны, драматычны і лірычны. Гэтыя спосабы псіхалагічнага аналізу даследчык спачатку разглядаў на матэрыяле расійскай прозы: у творах Пушкіна мелі месца «тыпова драматургічныя формы выражэння дзеяння [8, с. 37], раманы Лерманатава былі блізкія да лірыкі [8, с. 43], «гогалеўскі» спосаб псіхалагічнага аналізу вызначаўся як блізкі да эпічнага [8, с. 48], прычым «пушкінскі» і «гогалеўскі» спосабы псіхалагічнага аналізу пазіцыянаваліся як два тыпы аб'ектыўнага псіхалагізму, тым часам як лірычны псіхалагізм быў тоесны суб'ектыўнаму псіхалагічнаму аналізу.

Прапанаваная А.П. Матрунёнкам канцэпцыя не атрымала значнага распаўсюджання ў беларускім літаратуразнаўстве, але, цалкам верагодна, дапамагла даследчыку вызначыць умоўныя арыенціры, якія былі патрэбны для аналізу канкрэтнага літаратурнага матэрыялу: твораў Цішкі Гартнага, Якуба Коласа, Міхася Зарэцкага, Кузьмы Чорнага.

У дачыненні да творчасці Ц. Гартнага высновы А.П. Матрунёнка супадалі з меркаваннямі А. Адамовіча і М. Стральцова: «талент Гартнага – талент эпічны» [8, с. 74], таму ў рамане «Сокі цаліны» эпізоды, дзе аўтар звяртаецца да дынамічнага псіхалагізму, атрымліваюцца больш паспяховымі, чым пры звароце да аналітычнага псіхалагізму (карціны ўнутраных перажыванняў герояў не вельмі пераканаўчыя [8, с. 88]; «уся безліч дэталяў і падрабязнасцей слаба "працуе" на характары, існуе як бы сама па сабе, незалежна ад іх» [8, с. 75]).

Даследаванне прозы Я. Коласа дазволіла вылучыць некалькі этапаў у творчасці класіка. Напачатку пісьменнік «імкнуўся, як і ў лірыцы, авалодаць жыццём у яго аб'ектыўных, знешніх праявах – "гісторыі", здарэнні, бытавыя замалёўкі, сцэнкі, "спісаныя" аўтарам з самога жыцця, або запазычаныя з фальклору» [8, с. 115]. Другі этап азначаны спробай аналітычнага даследавання ўнутранага жыцця [8, с. 122], якую даследчык звязвае з такімі творамі, як «Новая зямля», «Сымон музыка», «На ростанях». Галоўны герой А. Лабановіч выяўляецца «ў адзінстве знешняга і ўнутранага, і дзейнічае і перажывае» [8, с. 138], мы бачым яго не толькі «знешне», але і «знутры», у шматлікіх карцінах і замалёўках плыні думак, пачуццяў, адчуванняў, настрояў, псіхалагічных станаў [8, с. 144]. Канец 1920-х гг. у творчасці Я. Коласа зноў адзначаны зваротам да дынамічнага псіхалагізму, «паваротам да "інтарэсу падзей"» [8, с. 159]. У пэўным сэнсе пераходным творам стала аповесць «На прасторах жыцця», дзе добра паказаны ўзаемаадносіны галоўных герояў і разам з тым «выразна праявілася тэндэнцыя да спрошчанага паказу жыцця паслярэвалюцыйнай вёскі» [8, с. 149].

Разнастайнай паўстае і проза Міхася Зарэцкага. Гэты празаік, як адзначаў А.П. Матрунёнак, паўстае «рамантыкам, схільным да высокай патэтыкі, драматызму, вострых канфліктаў і напружаных сюжэтных сітуацый» [8, с. 178]. Некаторым яго апавяданням уласцівыя «схематызацыя жыцця, згладжванне рэальнай складанасці і супярэчлівасці характараў і канфліктаў, імкненне ўціснуць іх у загадзя складзеныя абстрактныя формулы» [8, с. 176]. Але найбольш вядомыя творы М. Зарэцкага, пабудаваныя на «вострых унутраных калізіях, на ўнутраным дзеянні, на даследаванні пачуццяў і перажыванняў герояў» [8, с. 181]. Сярод іх пераважаюць «"біяграфіі" аднаго або двух-трох цэнтральных герояў, разгорнутыя ў карцінах іх унутраных перажыванняў» – «своеасаблівы ўнутраны партрэт чалавека, дадзены або "знутры", праз самааналіз, праз унутраную мову, або "збоку", вачыма аўтара, які сам даследуе душу свайго персанажа, або спалучэнне аўтарскага аналізу і самааналізу героя» [8, с. 181].

Значны раздзел прысвечаны творчасці Кузьмы Чорнага, які «з самага пачатку свайго творчага шляху складваецца як псіхолаг-аналітык, мастак “унутранага” чалавека» [8, с. 221]. Аднак у творчасці К. Чорнага таксама выявіліся адмоўныя тэндэнцыі савецкай эпохі. Як падкрэсліваў А.П. Матрунёнак, у 1930-х гг. творы К. Чорнага «пачынаюць “засяляцца” “напаўжывымі” профілямі, увасабленнямі пэўных сацыяльных становішчаў, груп, класаў, нацый, рэлігій. Яўная перавага абагульнення над індывідуалізацыяй вяла да таго, што не толькі другарадныя і эпізадычныя вобразы, але і вобразы пярэдняга плану як бы ачышчаюцца аўтарам ад усяго выпадковага і нехарактэрнага. У выніку характары збядняюцца, становяцца аднапланавымі, яны лягчэй ператвараюцца ў схемы, што выконваюць волю аўтара» [8, с. 288].

Аналіз беларускай прозы дазволіў прадэманстраваць, што аўтары «з’яўляюцца пераважна або “суб’ектыўнымі”, або “аб’ектыўнымі”» [8, с. 295], бо мае месца «ўнутраная “скіраванасць” самога таленту часцей толькі на пэўны тып псіхалагічнага аналізу» [8, с. 293]. Пры гэтым пісьменнік цягам усяго творчага шляху «як правіла, не застаецца ў межах нейкага аднаго тыпу псіхалагічнага аналізу» [8, с. 289], і часта на гэта ўплываюць экзагенныя фактары – абставіны літаратурнага жыцця, якія вымушаюць арыентавацца на пэўныя творчыя прынцыпы, што мела месца ў СССР у 1930–1950-я гг. А.П. Матрунёнак падкрэсліваў, што «надзейная гарантыя “нармальнасці” і натуральнасці развіцця жанру рамана» – гэта «суіснаванне і ўзаемадзеянне розных тыпаў псіхалагічнага аналізу» [8, с. 301].

Даследчык абіраў для аналізу самыя лепшыя творы – пры гэтым заўсёды імкнуўся да аб’ектыўнасці, звяртаў увагу не толькі на вартасці, але і на недахопы – у прыватнасці, твораў Ц. Гартнага, Я. Коласа, М. Зарэцкага, І. Шамякіна, Я. Брыля. Рэцэнзенты А.П. Матрунёнка таксама былі дастаткова крытычныя, і можна пагадзіцца, што ў першай манаграфіі даследчык часам быў занадта суб’ектыўным, а ў другой занадта рызыкоўна ставіў раман на першае месца ў параўнанні з іншымі літаратурнымі жанрамі.

У 1980 г. выйшла з друку калектыўная манаграфія «Нараджэнне новага мастацтва» (з падзагалоўкам «Сацыялістычны рэалізм – заканамернасць гістарычнага развіцця беларускай літаратуры»). Мэтай даследавання было «вывучэнне ўзнікнення і станаўлення сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры» [7, с. 3], але ў самым пачатку кнігі змяшчалася цытата з Д.Ф. Маркава [7, с. 7] – прагрэсіўнага на той час даследчыка, сапраўднага члена АН СССР, дырэктара Інстытута славяназнаўства. У 1970-я гг. Д.Ф. Маркаў прапанаваў канцэпцыю соцрэалізму як адкрытай эстэтычнай сістэмы, што фактычна легалізавала літаратуру, створаную паводле традыцый «не толькі рэалізму і “рэвалюцыйнага рамантызму”, але і ўсяго шырокага спектра сусветнага мастацтва» [9, с. 329].

Безумоўна, канцэпцыя Д.Ф. Маркава імпанавала А.П. Матрунёнку і многім ягоным калегам. І на старонках калектыўнай манаграфіі даследчык пісаў нязмушана і свабодна. У раздзеле «Праблема характару ў літаратуры сацыялістычнага рэалізму» А.П. Матрунёнак падкрэсліваў важнасць вобразаў-характараў у мастацкай прозе. Напачатку ён аналізаваў вобразы-персанажы ў творах Ядвігіна Ш., З. Бядулі, Цёткі, Я. Коласа, М. Гарэцкага з тым, каб выявіць іх адметнасць і вызначыць, да якой катэгорыі – тыпу ці характару – іх можна аднесці. Даследчык звяртаў увагу на шэраг цікавых тэм, яскравых мастацкіх вобразаў у дарэвалюцыйнай прозе і падкрэсліваў важную для кнігі ідэю: гістарычная заканамернасць станаўлення сацыялістычнага мастацтва выявілася ў яго здольнасці «браць у спадчыну ўсё лепшае ад літаратуры мінулых эпох і развіваць яго ў новых гістарычных умовах, на новым ідэйна-эстэтычным узроўні» [7, с. 260].

Аглядаючы творы 1920–1930 гг. ён падкрэсліваў недахопы прозы так званага «фальклорна-рамантычнага тыпу», героі якой былі шаблоннымі, спрошчанымі, схематычнымі. Як адзначаў даследчык, у гэтых творах «многае ідзе ад казкі і гераічнага эпасу, персанажы якіх таксама не маюць індывідуальна-непаўторнага пачатку. Індывідуальнае ў іх цалкам паглынаецца агульным, герой, па сутнасці, застаецца схемай, пустой абалонкай, ён роўны сваім подзвігам, учынкам і характарызуецца перш за ўсё тым, што ён робіць, а не тым, як ён гэта робіць» [7, с. 277]. Адной з характэрных уласцівасцей фальклорна-рамантычнай прозы, якая па сутнасці з’яўлялася мэйнстрымам савецкай літаратуры, было супрацьпастаўленне станоўчых і адмоўных персанажаў, дзе станоўчы персанаж – «носьбіт гераічных якасцей, даведзеных да крайнасці, гіпербалізаваных», яго антаганіст – «увасабленне суцэльнага зла, у ім усяляк падкрэсліваюцца праявы звярынай жорсткасці ў спалучэнні з такой жа паталагічнай баязлівасцю, схільнасцю да п’янства, распусты і г. д.» [7, с. 277]. Натуральна, такія вобразы ствараліся без звароту да псіхалагізму таго ці іншага тыпу. І калі А.П. Матрунёнак у пачатку раздзела акцэнтаваў важнасць характару як «галоўнай, цэнтральнай праблемы літаратуры» [7, с. 201], то напрыканцы недвухсэнсоўна ўказваў на тое, што многія вобразы-персанажы ў творах 1920–1930 гг. не мелі вялікай мастацкай значнасці праз ідэалагічную зададзенасць, шматлікія абмежаванні, якія ўводзіліся ў той час для творцаў.

Падагульненнем даследаванняў А.П. Матрунёнка стала манаграфія «Псіхалагічная проза» (1988). Першы раздзел – «Псіхалагічная проза. Пытанні тэорыі і гісторыі», – які складае амаль палову кнігі, прысвечаны развіццю жанру рамана з антычных часоў і выяўленню розных тыпаў псіхалагізму.

Датычна беларускай прозы А.П. Матрунёнак звяртаў увагу на значную дыстанцыю ад прозы еўрапейскай: у той час, калі ў еўрапейскай літаратуры развіваўся раман патоку свядомасці, беларуская проза знаходзілася на этапе станаўлення [10, с. 90] і мела перад сабой «цэлыя эпохі развіцця сусветнай прозы ў жанры рамана» [10, с. 109]. Даследчык шмат разважаў пра «спецыфіку прагрэсу ў літаратурах позняга фарміравання» [10, с. 111], пра асаблівасці паскоранага развіцця беларускай літаратуры.

На прыкладзе твораў Ядвігіна Ш, З. Бядулі, Я. Коласа, М Гарэцкага А.П. Матрунёнак прадэманстраваў, што 1900–1910-я гг. – час «першай хвалі суб’ектывізацыі» ў беларускай літаратуры. Развіццё суб’ектыўнага

пачатку ў прозе Ядвігіна Ш. выяўляецца ў апавяданнях, напісаных ад першай асобы [10, с. 133]; сярод твораў З. Бядулі маюць месца апавяданні, дзе даецца «грунтоўная псіхалагічная матывіроўка паводзін і ўчынкаў герояў» [10, с. 144]; суб'ектыўную манеру пісьма «з выкарыстаннем у той ці іншай ступені рамантычных спосабаў і сродкаў раскрыцця характараў» [10, с. 152] выкарыстоўваў М. Гарэцкі. Суб'ектывізацыя мела месца і ў паслярэвалюцыйнай прозе – у творах Я. Коласа, М. Гарэцкага, М. Зарэцкага. У манаграфіі паўтараюцца крытычныя пасажы, якія тычацца героіка-рамантычнай аповесці і апавядання, на прыкладзе творчасці М. Зарэцкага яскрава выяўлены складанасці, якія ў 1920–1930-х гадах чакалі пісьменнікаў пры распрацоўцы станоўчых і адмоўных вобразаў. Такім чынам, аналіз вобразаў-персанажаў, выяўленне розных тыпаў псіхалагізму дазволіла даследчыку звярнуць увагу як на дасягненні беларускай прозы, так і на яе праблемы.

Аналіз прац А.П. Матрунёнка дазваляе звярнуць увагу на шэраг іншых важных аспектаў:

– стаўленне даследчыка да еўрапейскай прозы – падаецца, у параўнанні з калегамі ён найбольш прыхільна і зацікаўлена пісаў пра Дж. Джойса, Н. Сарот і іншых пісьменнікаў-мадэрністаў;

– плённы ўдзел А.П. Матрунёнка ў дыскусіі пра фарміраванне беларускай літаратуры XX ст. – палемізуючы з навукоўцамі, якія адстойвалі канцэпцыю «перарастання фальклорнай прозы ў літаратурную» [10, с. 93], ён звяртаў увагу на вельмі важную акалічнасць – абумоўленасць прозы пачатку XX ст. запатрабаваннямі і густамі тагачаснага чытача;

– асэнсаванне спецыфікі жаночых вобразаў у мужчынскай прозе XX ст. – у манаграфіях А.П. Матрунёнка ў параўнанні з працамі іншых літаратуразнаўцаў аналізу жаночых вобразаў прысвечана шмат увагі і зроблена багата цікавых назіранняў.

**Заключэнне.** Грунтоўны аналіз твораў 1910–1960 гг. дазволіў А.П. Матрунёнку зрабіць шэраг трапных заўваг, якія тычыліся асаблівасцей творчай манеры пісьменнікаў, распрацоўкі пэўных вобразаў, тэм і праблем. У якасці прыкладу можна прывесці старонкі, на якіх літаратуразнаўца разважаў пра глыбокую сацыякультурную абумоўленасць беларускага падыходу да тэмы кахання ў мастацкай прозе [10, с. 148] або праз супастаўленне жаночых вобразаў у творах Я. Коласа і З. Бядулі звяртаў увагу на яскравыя адрозненні ў мастацкай канцэпцыі чалавека [7, с. 237]. Працы А.П. Матрунёнка былі яскравым прыкладам таго, што выкарыстанне пэўнай метадалогіі, уважлівая праца з творам дазваляе рабіць як канкрэтныя, цалкам абгрунтаваныя высновы па літаратуры пэўнага перыяду, так і цікавыя назіранні па асобных мастацкіх тэкстах. Даследчыкі, якія вывучаюць творчасць Я. Коласа, З. Бядулі, М. Зарэцкага, М. Гарэцкага, Я. Брыля і сёння могуць знайсці шмат карысных ідэй у працах А.П. Матрунёнка.

ЛІТАРАТУРА

1. Хализев, В.Е. О составе литературоведения и специфике его методологии / В.Е. Хализев // Социальные и гуманитарные науки в XX веке : сб. ст. / редкол.: А.А. Ревякина [и др.]. – М. : ИНИОН РАН, 2001. – С. 7–29.
2. Синенко, Г. Исследуется современная проза / Г. Синенко // Нёман. – 1974. – № 5. – С. 182–185.
3. Матрунёнак, А.П. Псіхалагічны аналіз у сучасным беларускім рамане / А.П. Матрунёнак. – Мінск : Навука і мастацтва, 1972. – 221 с.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы – Мінск : Бел. навука, 1999–2003. – Т. 4, кн. 1 : 1966–1985. – 2002. – 928 с.
5. Андраюк, С. Сваім шляхам / С. Андраюк // Маладосць. – 1973. – № 2. – С. 144–147.
6. Юрэвіч, У. Псіхалагічны грунт рамана / У. Юрэвіч // Полымя. – 1973. – № 2. – С. 229–234.
7. Матрунёнак, А.П. Праблема характару ў літаратуры сацыялістычнага рэалізму / А.П. Матрунёнак // Нараджэнне новага мастацтва / Л.Я. Гаранін, А.С. Яскевіч, А.П. Матрунёнак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 328 с.
8. Матрунёнак, А.П. Псіхалагічны аналіз і станаўленне беларускага рамана / А.П. Матрунёнак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 304 с.
9. Будагова, Л.Н. Ипостаси и варианты «самого прогрессивного метода эпохи». К столетию со дня рождения Дмитрия Федоровича Маркова / Л.Н. Будагова // Славянский альманах: 2014. – М. : Индрик, 2014. – Вып. 1–2. – С. 321–333.
10. Матрунёнак, А.П. Псіхалагічная проза: Традыцыі і час / А.П. Матрунёнак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 205 с.

*Паступіў 04.06.2020*

**THE STUDY OF PSYCHOLOGISM IN BELARUSIAN PROSE IN A. MATRUNENAK'S WORKS**

***A. CHARNAVOKAYA***

*The article is devoted to the works of the literary critic Alfred Matrunenak (born in the village of Podoby, Vitebsk region). A. Matrunenok studied the prose of Yakub Kolas, Zmitrok Byadula, Kuzma Chorny, Ivan Shamyakin, Yanka Bryl, Ivan Melezh and others. The distinctive feature of his works is an in-depth professional analysis of artistic texts, focus on a specific research methodology. A. Matrunenok was interested in European prose of the second half of the XXth century, he paid attention to both the successes of Belarusian literature and its problems caused by the negative tendencies of the Soviet period. A. Matrunenak's works reveal the peculiarities of Belarusian writers' style, compare different approaches to the psychological development of characters.*

***Keywords:*** *history of Belarusian literary criticism, analysis of literary text, analytical psychologism, character, Soviet ideology.*